***Субоцін Аляксандр Аляксандравіч,***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін
Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта (Віцебск, Беларусь)

# Стаханаўскі рух у сельскай гаспадарцы БССР падчас другой пяцігодкі (1935–1937 гг.)

Адным з ключавых феноменаў савецкай гісторыі, што паўплываў на развіццё эканомікі, сацыяльных адносін і псіхалогію грамадства, з’яўляецца стаханаўскі рух. Гэта форма сацыялістычнага спаборніцтва бярэ свой пачатак з 1935 г. і ў далейшым атрымлівае сваё развіццё практычна ва ўсіх сферах гаспадарчай дзейнасці. У гістарыяграфіі тэма стаханаўскага руху разглядалася пераважна праз аналіз метадаў працы ў прамысловасці і іх уплыў на павышэнне прадукцыйнасці яе ключавых галін. У той жа час даследаванне спецыфікі стаханаўскага руху ў сельскай гаспадарцы не знайшло належнага адлюстравання ў працах гісторыкаў. У гэтым кантэксце як раз эканоміка БССР першых пяцігодак уяўляла сабой той прыклад, дзе сельскагаспадарчая вытворчасць займала значнае месца, а працэс разгортвання стаханаўскага руху ў калгасах і саўгасах стаў новым этапам арганізацыі працоўнай дзейнасці.

Мэтай даклада з’яўляецца выяўленне асаблівасцяў разгортвання стаханаўскага руху ў сельскай гаспадарцы БССР у гады другой пяцігодкі.

У аграрным сектары БССР першыя стаханаўцы з’яўляюцца сярод работнікаў МТС, асноўная праца якіх напрамую была звязана з прымяненнем сельскагаспадарчай тэхнікі і адкрывала шырокія магчымасці для вынаходніцтва новых метадаў яе максімальнага выкарыстання па прыкладу Стаханава. За кошт удасканалення тэхнічных магутнасцяў трактароў і ўборачнай тэхнікі, змены рэжыму іх працы рабочыя МТС павялічвалі ў некалькі разоў плошчу апрацаванай зямлі. Напрыклад, у Полацкай акрузе сваёй выдатнай працай вылучыўся стаханавец Т. Плешчанок з Асвейскай МТС, які выпрацаваў на сваім трактары за асенні сезон 1935 г. 506 га мяккай пашы [1, арк. 264–265]. Станоўчых вынікаў дабіўся стаханавец А.Хомчанка (Забычанская МТС), які выпрацаваў 886 га пашы пры норме ў 380 га і сэканоміў 1600 кг гаручага [2, с. 7]. Восенню 1935 г. стаханаўка Лёзненскай МТС А. Шабашова выпрацавала на сваім

трактары 1236 га мяккай пашы і паставіла тым самым рэспубліканскі рэкорд сярод трактарыстаў [3, арк. 6].

У той жа час у другой палове 1930-х гг. у сельскай гаспадарцы вытворчыя працэсы былі яшчэ слаба механізаваныя, а асноўныя аперацыі ў яе галінах былі разлічаны на выкарыстанне пераважна ручной працоўнай сілы. На такага роду ручной працы асаблівую вядомасць у якасці стаханаўцаў атрымлівалі сяляне, якія былі занятыя ў адной з вядучых галін рэспублікі – ільнаводстве. Сярод іх у БССР, напрыклад, сваімі стаханаўскімі рэкордамі вылучыліся льнотрапальшчыцы П. Пярцова, М. Дзяжурная, М. Рагоўская і С.Быкоўская, якія апрацоўвалі за дзень па 50–60 кг ільновалакна пры агульнапрынятай норме ў 10–12 кг. М. Дзяжурная, напрыклад, увогуле паставіла рэспубліканскі рэкорд і натрапала за дзень 66 кг 600 г лёну [4, с. 4]. Пры вырошчванні лёну і яго зборы сваю выдатную працу паказалі стаханаўцы з Дрысенскага раёна У. Спіжаль і М. Апачанка, паляводчыя звенні якіх дасягнулі ўраджайнасці адзначанай сельскагаспадарчай культуры да 8 ц з га [5, арк. 160].

Выдатныя вынікі на працэсах вырошчвання і апрацоўкі лёну, як і ў цэлым па раслінаводстве, дасягаліся стаханаўцамі на аснове пераразмеркавання дапаможнай працы на іншых сялян. У некаторых выпадках такія аперацыі выконвалі блізкія сваякі стаханаўцаў. Напрыклад, стаханаўка П. Пярцова толькі трапала лён, а дапаможныя працэсы па яго пераносе і ачыстцы выконвала яе дачка [4, с. 4]. А стаханаўцы А. Калбёнак пры апрацоўцы льну дапамагала яе шасцідзесяцігадовая маці [6, с. 16]. Такія выпадкі былі абумоўлены самой спецыфікай арганізацыі працы на вёсцы, калі ў склад паляводчага звяна часта ўваходзілі прадстаўнікі аднаго сялянскага двара ці сям'і. Акрамя таго, павышэнне прадукцыйнасці і разгортванне стаханаўскага руху ў раслінаводстве забяспечваліся за кошт дакладнага выканання агранамічных патрабаванняў у працэсе вырошчавання сельскагападарчых культур.

У жывёлагадоўлі, якая таксама была разлічана на выкарыстанне пераважна ручной працы, высокія паказчыкі пры разгортванні стаханаўскага руху сталі вынікам выдатнага догляду жывёл і ўсталявання сістэмы іх якаснага кармлення. Так, сярод свінароў рэспублікі сваёй працай стаў вядомы стаханавец М. Зуеў, які за кошт прымянення пералічаных метадаў дабіўся жывога прыплоду свіней да 150 % ад плана і росту іх сярэднясутачнай вагі да 1000 г [7, с. 108].

У сферы авечкагадоўлі стаханавец У. Шкарадзёнак амаль удвая павялічыў вытворчы выхад поўсці ад авечак і дабіўся сярэдняга прыплоду да 1,5 ягнёнка ад аўцаматкі [8, арк. 16].

Разгортванне стаханаўскага руху ў сельскай гаспадарцы БССР прывяло да росту за 1935 г. усіх відаў жывёл: пагалоўе буйной рагатай жывёлы павялічылася на 23,7 %, коней – на 0,9 %, авечак і коз – на 12,4 %, свіней – на 34,4 %; такі рост адбыўся ўпершыню пасля 1928 г. [9, с. 75]. У прыватнасці, па Бабруйскім раёне на пачатак 1936 г. у параўнанні з 1934 г. сярэднегадавы надой на 1 карову павялічыўся з 800 літраў да 1300 літраў, сярэдні выхад парасят на 1 свінаматку ад 3 да 6,6 галоў, выхад цялят на 100 кароў ад 73 да 99 галоў, выхад ягнят на 100 аўцаматак – ад 91 да 110 галоў, выхад жарабят на 100 конематак – ад 20 да 23,3 галоў [10, арк. 31]. За кошт прымянення стаханаўскіх метадаў працы частка гаспадарак датэрмінова завяршыла пасяўную кампанію вясной 1936 г. Так, па рэспубліцы пасеў зерневых культур планавалася скончыць да 15 мая, але, напрыклад, калгасы “Камунар” Нараўлянскага раёна, “Новы свет” Лёзненскага раёна і “Чырвоны партызан” Мінскага раёна завяршылі пасяўную кампанію да 1 мая [11, арк. 86; 285, арк. 116, 120, 129]. У цэлым вясной 1936 г. планавыя нормы работы пры апрацоўцы мяккага ворыва былі выкананы па БССР на 139,7 % [12, с. 96].

Нягледзячы на тое, што стаханаўскі рух паспрыяў значнаму павышэнню прадукцыйнасці працы і перавыкананню планаў, ажыццявіць інтэнсіўнае разгортванне адзначанай формы сацыялістычнага спаборніцтва і цалкам перавесці эканоміку на стаханаўскія тэмпы працы не ўдалося. Стаханаўскі рух даваў станоўчыя вынікі там, дзе былі для гэтага рэальныя рэзервы, але пры штучным яго ўвядзенні пачалі назірацца выпадкі дэзарганізацыі кіравання вытворчасцю, збоі ў працэсах выпрацоўкі прадукцыі, былі парушаны вытворчыя сувязі. Стаханаўскі рух суправаджаўся фармальнымі адносінамі кіраўнікоў некаторых гаспадарчых адзінак да яго разгортвання, дзе ўвага надавалася росту колькасці стаханаўцаў, а не рэальнаму павышэнню прадукцыйнасці працы; акрамя таго, мелі месца такія з’явы, як “штурмаўшчына” і “кампанейшчына”, калі стаханаўскія метады працы прымяняліся не сістэматычна, а толькі ў пэўныя адрэзкі часу для знешняй дэманстрацыі разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва.

Шэраг падобных негатыўных з’яў меў месца і ў сельскай гаспадарцы БССР, што было звязана пераважна з працэсам самой арганізацыі стаханаўскага руху. Так, па Чавускім раёне вясной 1936 г. стаханаўскі рух не быў разгорнуты ў калгасах “Свабода”, “Сталінскі шлях”, “Новы шлях”, “Непераможны”, дзе не было зафіксавана ні аднаго стаханаўца [13, арк. 36, 43, 47, 51, 139]. У ліпені 1936 г. М. Ф. Гікала на пасяджэнні старшынь райвыканкамаў указваў на тое, што развіццё стаханаўскага руху ў калгасах пры ўборцы ўраджаю адышло на другі план, а прыклады дасягненняў асобных стаханаўцаў не распаўсюджваюцца ў працоўных калектывах [14, арк. 58]. Па Ветрынскім і Дрысенскім раёнах мясцовымі партыйнымі органамі ў снежні 1936 г. было ўстаноўлена, што кіраўніцтва часткі калгасаў не вядзе ніякага ўліку стаханаўцаў пры перавыкананні калгаснікамі норм, а таксама не садзейнічае распаўсюджванню сацыялістычнага спаборніцтва [15, арк. 523, 538]. На некаторых гаспадарчых адзінках стаханаўскі рух хоць і быў разгорнуты, але інтэнсіўнае выкананне планавых паказчыкаў прыводзіла да вытворчых збояў. Напрыклад, у саўгасах Віцебскага Саюзмалтрэста засяроджванне сіл на перавыкананні планаў уборкі ўраджаю 1936 г. не дазволіла ў дастатковай меры заняцца іншымі сельгаспадарчымі працамі, дзе ў выніку ўзнікалі недахопы [16, арк. 44].

Пералічаныя вышэй недахопы ставіліся ў віну мясцовым кіраўнікам і гаспадарнікам, у рамках чаго і была разгорнута палітычная кампанія ў барацьбе са “шкоднікамі” і “сабатажнікамі” стаханаўскага руху.

У той жа час мы можам свцярджаць, што ў сельскай гаспадарцы БССР стаханаўскія формы працы па-ранейшаму атрымлівалі распаўсюджванне. Так, сярод рабочых МТС вылучыўся стаханавец В. Ліпень (Пухавіцкая МТС), які восенню 1936 г. апрацаваў 1208 га пашы і сэканоміў 2600 кг гаручага, стаханавец Т. Слабодчыкаў (Чырвонапольская МТС) апрацаваў 1223 га, сэканоміўшы 6000 кг гаручага, стаханавец Д. Асадчык (Церахаўская МТС) апрацаваў 1180 га пры эканоміі гаручага ў 2120 кг, стаханавец К. Свірыд з Хойніцкай МТС на малатарні МК1100 намалаціў 1674 ц зерня [17, с. 34]. Актыўна стаханаўскія метады па БССР прымяняліся і ў ільнаводстве, дзе ў рамках сацыялістычнага спаборніцтва ў 1936 г. узнікае рух тысячніц, накіраваны на дасягненне ўраджаю ільну да 1000 кг з гектара. У 1936 г. у Дрысенскім раёне вылучыліся

стаханаўкі А. Грыгуць і В. Валенцік, звенні якіх амаль дасягнулі такой мэты і сабралі адпаведна па 9,24 і 8,94 ц ільноваланка з га [15, арк. 160]. Ураджай каля 10 ц з га ў 1937 г. у Чавускім раёне сабралі стаханаўскія звенні В. Дзюбаковай, М. Маханенкавай, К. Лазарэнка і В. Сапраненкавай [18, с. 41].

Такім чынам, разгортванне стаханаўскага руху ў аграрным сектары БССР мела месца перш за ўсё сярод работнікаў МТС, дзе як раз і прымяняліся метады ўдасканалення працы на сельскагаспадарчай тэхніцы. У большасці ж гаспадарак стаханаўскі рух праявіў сябе ў метадах перазмеркавання працы сярод сялян і ў якасным выкананні агранамічных і заатэхнічных патрабаванняў. У цэлым можна казаць пра станоўчы ўплыў стаханаўскага руху на павышэнне прадукцыйнасці працы ў сельскай гаспадарцы рэспублікі за 1935–1937 гг., але ў той жа час гэта форма сацыялістычнага спаборніцтва не набыла такога разгортвання, як у прамысловасці і на транспарце, што было звязана з нізкім узроўнем забеспячэння тэхнікай калгасаў і саўгасаў, а таксама з негатыўнымі з'явамі пры арганізацыі саміх стаханаўскім кампаній.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Занальны дзяржаўны архіў у горадзе Полацку (далей – ЗДА у г. Полацку). Ф. 104. Воп. 1. Спр. 92.
2. Сперанскі В. Ільноцерабільшчык Афанасій Хомчанка. Мінск: Дзярж. выд-ва Беларусі, 1939. 16 с.
3. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей – ДАВВ). Ф. 9742. Воп. 3. Спр. 23.
4. М. Дзяжурная рашыла перагнаць П. Пярцову. *Звязда*. 1935. 3 снеж. С. 4.
5. ДАВВ. Ф. 10061. Воп. 2. Спр. 75.
6. Рабая. Спаборніцтва з дачкой. *Работніца і калгасніца Беларусі*. 1935. №21. С. 16.
7. Кудзінаў С. Стаханаўскі рух у мясамалочных саўгасах БССР. *Сацыялістычнае будаўніцтва*. 1936. №1–2. С. 107–110.
8. ДАВВ. Ф. 10061. Воп. 2. Спр. 73.
9. Владзімірскі Н. Жывёлагадоўля БССР на ўздыме. *Сацыялістычнае будаўніцтва*. 1936. №4–5. С. 75–91.
10. Дзяржаўны архіў грамадскіх арганізацый Магілёўскай вобласці (далей – ДАГАМВ). Ф. 2952. Воп. 1а. Спр. 407.
11. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 10784.

12. Стаханаўцы сельскай гаспадаркі БССР. *Сацыялістычнае будаўніцтва*. 1937. №1. С. 94–102.
13. ДАГАМВ. Ф. 39. Воп. 1а. Спр. 339.
14. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 10782.
15. ЗДА у г. Полацку. Ф. 104. Воп. 1. Спр. 93.
16. ДАВВ. Ф. 932. Воп. 1. Спр. 349.
17. Сацыялістычнае будаўніцтва ордэнаноснай Беларусі: да надзвычайнага XII з’езда Саветаў БССР. Мінск: Дзярж. планавая каміс., 1937. 59 с.
18. Чэтверыкоў В.Н. Як стаханаўцы-калгаснікі Чаўскага раёна атрымалі тону льноволакна з гектара. Мінск: Выд-ва АН БССР, 1937. 88 с.

* * *

***Тогулева Алена Дзмітрыеўна,***
кандыдат гістарычных навук, дэкан факультэта перападрыхтоўкі кадраў ІПКіПК,
дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава
(Віцебск, Беларусь)

## Пытанне беларускай дзяржаўнасці ў праграмных дакументах Беларускай сацыялістычнай грамады (сакавік – кастрычнік 1917 г.)

Лютаўская рэвалюцыя ў 1917 г. знішчыла царскае самадзяржаўе. Гэта стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця ў краіне дэмакратычных асноў і адраджэння нацыянальных рухаў прыгнечаных народаў Расіі, у тым ліку і беларускага. Беларусы, як і астатнія народы Расійскай імперыі, атрымалі надзею дабіцца калі не поўнай незалежнасці, то ва ўсякім разе аўтаноміі. Гэта надзея стала цэнтрам палітычнай барацьбы ў беларускім краі, актывізаваўшы нацыянальна-вызваленчы рух, які ў сваю чаргу з’явіўся састаўной часткай агульна-дэмакратычнай барацьбы беларускіх працоўных.

Беларуская сацыялістычная грамада як першая нацыянальная беларуская партыя ў пачатку XX ст. адлюстроўвала спецыфічна беларускія інтарэсы маладой, яшчэ кволай нацыі, звярталася да беларускага народа на яго роднай мове, выступала за вырашэнне сацыяльных праблем беларускіх працоўных і за ўтварэнне беларускай дэмакратычнай дзяржавы.

Беларуская сацыялістычная грамада аднавіла сваю дзейнасць адразу пасля Лютаўскай рэвалюцыі. У звяржэнні самадзяржаўя і